***Шчэрбін М.М.***
***УА МДПУ ім. І. П. Шамякіна***
***г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь***

**АСАБЛІВАСЦІ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ БЕЛАРУСАЎ**

Народныя традыцыі выхаваня заўсёды маюць цесную сувязь з сістэмай жыццядзейнасці і адносін з навакольным асяроддзем. Менавіта праз уключэнне ў працоўную, бытавую, гаспадарчую, рытуальна-абрадавую дзейнасць адбывалася ўваходжанне дзіцяці ў дарослы свет і замацаванне неабходных жыццёвых якасцей. Сярод такіх якасцей выключнае месца належыць адносінам да Радзімы. Любоў да бацькоў, прывязанасць да родных мясцін, роднай прыроды утваралі той жыццёвы падмурак, на якім адбывалася самавызначэнне чалавека, будаваліся адносіны з людзьмі. Гэтыя адносіны садзейнічалі развіццю павагі і любові да старэйшых, калектывізму і ўзаемадапамогі ў зносінах з іншымі людзьмі, клопату і беражлівасці ў дачыненні да прыроды. Запатрабаванасць патрыятычных якасцей і пачуццяў была абумоўлена таксама іх моцным кансалідуючым характарам, скіраваным на грамадска-карысную дзейнасць. Таму, што ў народным разуменні нават асабістыя дзеянні, ў рэшце рэшт, павінны быць скіраваны да агульнага дабра.

Асаблівае стаўленне ў адносінах да родных мясцін для беларуса насіла як жыццёва-практычны, так і сімвалічны характар. Амаль усё, што было навокал, – лес, рэчка, поле – давала сродкі, дапамагала, падтрымлівала чалавека. Акрамя таго, глыбокі сэнс для нашых продкаў мелі ўяўленні аб сіле жмені роднай зямлі, моцы дрэва, якое пасадзіў дзед ля парога, жыватворных якасцях вады з роднай крыніцы. Моцная архаічная сувязь са шматлікімі матэрыяльнымі і нематэрыяльнымі аб’ектамі садзейнічала ўзнікненню цеснай пачуццёвай прывязанасці беларусаў да ўсяго “свайго” – зямлі, дома, лесу, поля і г.д. А “прынцып зямляцтва” увогуле быў гарантам падтрымкі на далекіх адлегласцях ад дому. Разам усё гэта стварала блізкі і зразумелы мікрасвет, які акружаў чалавека ўсё жыццё, выступаў значным выхаваўчым сродкам, крытэрыем лепшых рыс.

Народныя ўяўленні аб патрыятызме былі абумоўлены шэрагам вызначальных фактараў, звязанных з сістэмай жыццядзейнасці, сярод асноўных, што дэтэрмінавалі фарміраванне і замацаванне патрыятычных якасцяў беларусаў, можна вылучыць наступныя:

– прыродна-геаграфічны фактар. Шматлікія рэкі і балоты, вялікая колькасць лясоў, у асноўным раўнінны характар рэльефу тэрыторыі пражывання беларусаў – абумовілі пэўную ізаляванасць і замкнёнасць ладу жыцця. Гэта ў сваю чаргу прадвызначыла вялікую залежнасць чалавека ад прыроды, вымушала яго да наладжвання гарманічных адносін з наваколлем, спрыяла фарміраванню лірызму і пяшчоты, любавання прыгажосцю і непаўторнасцю ўсяго, што навокал, спараджала жаданне ахоўваць і аберагаць. У народзе лічылі: “у родным краю як у раю” [1, 523].

– гістарычны фактар. Умовы жыцця ў складзе моцнай сялянскай абшчыны, калектыўны характар дзейнасці і вырашэння асноўных праблем былі скіраваны не толькі на сумесныя работы, але садзейнічалі існаванню значнай падтрымкі чалавека ў любых жыццёвых сітуацыях, развіццю спагадлівасці, чуласці, праўдзівасці ў адносінах з іншымі людзьмі. ”З людзьмі згода як у жніво пагода” [1, 515] або”у лесе людзі дзічэюць, а сярод людзей люднеюць [1, 520], сцвярджалі прыказкі.

– сацыяльна-эканамічны фактар. Земляробства як асноўны занятак, аграрна-патрыярхальны лад жыцця, промыслы і рамёствы, якія забяспечвалі ўсім неабходным, ператваралі сялянскую гаспадарку ў самастойны вытворчы калектыў з вялікім дыяпазонам гаспадарчай дзейнасці. Вось чаму дбайнасць, стараннасць, гаспадарлівасць і працалюбства заўсёды былі абавязковымі якасцямі сапраўднага чалавека і патрыёта сваёй зямлі. Народная мудрасць падкрэслівала, што”хто дбае, той і мае” [1, 552] і “працу любіш – чалавекам будзеш” [1, 443].

– поліканфесіянальны фактар. Неабходнасць мірнага суіснавання на працягу стагоддзяў язычніцкіх вераванняў, розных плыняў хрысціянства (праваслаўя, каталіцтва, пратэстантызму, уніяцтва), а таксама шматлікіх прымхаў і забабонаў побач з іўдаізмам і мусульманствам прадстаўнікоў іншых народаў, што здаўна жылі на беларускіх тэрыторыях, прывяла да развіцця павагі да іншага меркавання, гуманных адносін і талерантнасці, гасціннасці і адкрытасці ў адносінах з людзьмі пры развітым пачуцці ўласнай годнасці. Прыказка тлумачыла:”Чужое паважай, але і свайму ганьбы не давай” [ 1, 587].

– гендэрны фактар. Існаванне і выразнае размежаванне мужчынскіх і жаночых якасцей было акрэслена ўсёй сістэмай народнай жыццядзейнасці. І як у іншых народаў, пры адноснай запатрабаванасці мужчынскіх мужнасці, цвёрдасці, рашучасці, асноўным выхавацелем гэтых якасцей была сціплая, спакойная, памяркоўная жанчына-маці. Таму, магчыма, нават самыя мужчынскія якасці беларусаў не ўтрымлівалі жорсткасці, знявагі і нянавісці нават ў адносінах да ворагаў, а міласэрнасць суседнічала са здольнасцю да самаахвяравання. Да таго ж можна назваць павагу да старэйшых, якая, увогуле, была адной з грамадска-ўтваральных якасцей чалавецтва яшчэ са старажытных часоў. “Добра нават ворагу сказаць прыемнае слова” – сцвярджала народная мудрасць з гэтай нагоды [1, 181].

Вышэйназваныя фактары праціналі ўсю сістэму жыццядзейнасці беларусаў, рэгламентавалі дзеянні і ўчынкі чалавека з маленства і, безумоўна, значна ўплывалі на ўсё народнае выхаванне, у тым ліку і патрыятычнае.

Пагэтаму на падставе адзначаных фактараў можна вызначыць змястоўна-утваральныя, базісныя кампаненты патрыятычнага народнага выхавання, што вызначалі яго асаблівасці, уплывалі на складванне ўяўленняў аб патрыятычным ідэале. Сярод асноўных можна назваць:

1. Маральны кампанент. У народным разуменні патрыятызм выступае як маральная якасць, што характарызуе сапраўднага чалавека. Даследчыкі народнай педагогікі справядліва зазначаюць, што менавіта “этыка-маральнае напаўненне паняцця дасканалага чалавека ў этнічнай педагогіцы беларусаў з’яўляецца найважнейшым” [2, 64]. Вось чаму, згодна з народнымі уяўленнямі, без глыбокай маральнай асновы немагчыма быць патрыётам. Толькі той чалавек, які дзейнічае з пазіцый справядлівасці, праўды і любові ў адносінах з людзьмі і грамадствам, можа лічыцца паўнапраўным членам гэтага грамадства і патрыётам.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Гуманістычны кампанент. Яшчэ з архаічных часоў чалавекалюбства з’яўлялася закладам сумеснага пражывання. Пазней хрысціянскі прынцып любові да бліжняга ўзвёў гэту якасць у ранг найважнейшых дабрачыннасцей веруючага чалавека. Нават у выключных абставінах, пры вырашэнні нацыянальных пытанняў не сіла, а любоў да іншых людзей павінна прыміраць пазіцыі супрацьлеглых бакоў. Вядомыя словы воіна-малітоўніка Аляксандра Неўскага напярэдадні вырашальнай Неўскай бітвы “Не ў сіле Бог, а ў праўдзе!” на стагоддзі вызначылі погляды на ўзаемаадносіны з людзьмі, спосабы вырашэння канфліктаў на ўсіх славянскіх тэрыторыях [3, 112]. Прычым як агульнаславянскія, так і беларускія ўяўленні аб гуманізме мелі патрыятычны вектар. Яны былі заўсёды накіраваны на “сваё”, а не супраць іншых, не ўтрымлівалі нянавісці і перавагі ў адносінах з іншымі людзьмі а, у асобных абставінах, даходзілі нават да самаахвяравання – за зямлю, за веру, за родных і г. д.

3. Працоўны кампанент. Праца, як крыніца жыцця, выступала сродкам выхавання лепшых якасцей чалавека. Вось чаму, згодна з народных уяўленнямі адносіны да працы з’яўляліся крытэрыем “чалавечнасці”. Асабліва праца на зямлі надзялялася высокім маральным статусам. “Хто сее хлеб, той сее праўду”, – казалі ў народзе [1, 564]. Пагэтаму стваральная праца на роднай зямлі на агульную карысць, падмацаваная шэрагам маральных якасцей, - годны занятак для сапраўднага чалавека-патрыёта. Адсюль асноўным абавязкам сялян было не проста апрацоўваць родную зямлю з мэтай атрымання ўраджаю, а клапаціцца аб ёй і аберагаць яе як крыніцу жыцця, сімвал роду і сям’і, дабрабыту і, галоўнае, перадаць сваім нашчадкам усведамленне таго, што гэта – найвялікшая каштоўнасць. А селянін-працаўнік, які добрасумленна працуе на сваёй зямлі, клапоціцца пра яе і засцерагае яе, а ў выключных абставінах гатовы за яе і пастаяць, і ёсць сапраўдны патрыёт.

У фальклорнай традыцыі побач з дадзеным вобразам атрымлівае распаўсюджванне ў якасці патрыятычнага ідэалу былінны волат, які «зямлі абарона і апора" [3, 125]. Менавіта волаты, надзеленыя звышнатуральнай сілай, магутныя, адважныя, справядлівыя, служаць і бароняць «зямлю-матухну», «веру хрысціянскую», нічога не патрабуючы ўзамен. Забіяка Н.С. справядліва адзначае, што гэтым асілкам уласцівы матыў святасці, таму, што іх сіла накіравана на «ўсеагульную карысць», супраць «сіл зла і бязбожнасці» [3, 126]. Прычым фальклор дае прыклады злучэння ў адным вобразе і аратага, і волата. Напрыклад, Мікула Селянінавіч, які і за стопудовай сахой ідзе і, калі трэба, парадак навядзе.

Гэтыя складовыя кампаненты, якія абапіраліся на светапоглядныя імператывы нашага народа, з’яўляліся крыніцай выхаваўчых метадаў і сродкаў патрыятычнага выхавання, выступалі ў якасці матываў і стымулаў, што заахвочвалі адпаведныя дзеянні і ўчынкі, стымулявалі выпрацоўку каштоўнасных арыентацый.

І, у рэшце рэшт, не так прынцыпова ці з мячом на мяжы стаяць і сілай фізічнай абараняць або за сахой ісці і сілай стваральнай працы клапаціцца аб сваёй зямлі. У народным разуменні кожны чалавек карысны на сваім месцы, асабліва, калі яго дзеянні накіраваны ў рэчышча агульнага дабра і справядлівасці. Таму, што “добрая ўсякая зямля, а лепш усіх зямля свая” [1, 184].

Такім чынам, этнічныя асаблівасці народа, што выпрацоўваліся стагоддзямі, прайшлі выпрабаванне часам, на ментальным узроўні зразумелыя і прыдатныя, павінны стаць пачаткам пры распрацоўцы сучасных выхаваўчых праграм і канцэпцый. Таму, што ўлік этнакультурных гістарычных традыцый дапаможа захаваць пераемнасць, удакладніць мэты і задачы, узбагаціць метады і сродкі, што дазволіць павысіць выніковасць выхавання патрыятызму на сучасным этапе.

Літаратура

1. Лепешаў, І.А. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – 695 с.
2. Болбас, В. С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 175 с.
3. Федотов, Г. П. Святые Древней Руси / Г.П. Федотов. – Ростов-на-Дону: ”Феникс”, 1999. – 384 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина